Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»
Кафедра культуралогіі
НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Лабараторыя праблемаў выхавання асобы
Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт
Аддзел фізічнай культуры, спорта і турызму

# КУЛЬТУРА ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ МОЛАДЗІ: ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

Том 1

Брэст
«Альтернатива»
2010

Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна»
Кафедра культуралогіі
НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Лабараторыя праблемаў выхавання асобы
Брэсцкі гарадскі выканаўчы камітэт
Аддзел фізічнай культуры, спорта і турызму

# КУЛЬТУРА ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ МОЛАДЗІ: ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

**Зборнік навуковых прац**

У двух тамах

Том 1

Брэст
«Альтэрнатива»
2010

УДК 379.82/.84-053.5/.8(082)
ББК 77я43
К20

Рэкамендавана да публікацыі кафедрай культуралогіі
Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна
(пратакол № 8 ад 31 сакавіка 2010 года)

Рэдакцыйная калегія:
Ул.П. Люкевіч (старшыня, Брэст), В.Я. Бужынскі (Бяла Падляска),
Г.І. Іванчын (Брэст), А.С. Лапцёнак (Мінск), А.Р. Рафікава (Мінск)

Рэцэнзент:
прафесар А.А. Гарбацкі

*Аргкамітэт і ўдзельнікі Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі
"Культура правядзення вольнага часу моладзі: праблемы і перспектывы"
выказваюць шчырую падзяку за дапамогу ў выданні зборніка навуковых прац
Аддзелу фізічнай культуры, спорта і турызму Брэсцкага гарвыканкаму
і асабіста яго начальніку А.У. Бяспалаву*

К20 **Культура** правядзення вольнага часу моладзі: праблемы і перспектывы : зб. навук. прац. У 2 т. Т. 1 / Брэсц. дзярж. ун-т імя А.С. Пушкіна [і інш.] ; рэдкал.: Ул.П. Люкевіч [і інш.]. – Брэст : Альтернатива, 2010. – 124 с.

ISBN 978-985-521-152-6.

У зборнік уключаны артыкулы навукоўцаў Беларусі, Літвы, Расіі і Польшчы, у якіх разглядаюцца праблемы культуры правядзення вольнага часу моладзі.

Матэрыялы, якія змешчаны ў зборніку, можна выкарыстоўваць у працэсе выкладання гуманітарных дысцыплінаў, фармавання здаровага ладу жыцця, а таксама ў іншых формах працы па выхаванню моладзі.

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за граматычную правільнасць, падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, лічбаў, цытат, уласных назваў, прозвішчаў, імёнаў і іншай інфармацыі.

**УДК 379.82/.84-053.5/.8(082)**
**ББК 77я43**

**ISBN 978-985-521-152-6 (т. 1)**
**ISBN 978-985-521-151-9**

© УА «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна», 2010
© Афармленне. ПВГУП «Издательство "Альтернатива"», 2010

*УДК 008*

**Ул.П. ЛЮКЕВІЧ**
*Беларусь, Брэст, УА «Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А. С. Пушкіна»*

# НЕЗДАРОВЫ ЛАД ЖЫЦЦЯ Ў КУЛЬТУРЫ ПРАВЯДЗЕННЯ ВОЛЬНАГА ЧАСУ

Гульні мінулай (2010 года) Зімовай Алімпіяды ў канадскім Ванкуверы пакінулі самыя супярэчлівыя меркаванні. Ужо сам пачатак Гульняў, калі напярэдадні іх урачыстага адкрыцця пад час трэніроўкі трагічна загінуў грузінскі саначнік Надар Кумарыташвілі, і потым, калі на працягу іх правядзення спартоўцы атрымлівалі балючыя траўмы, напрыклад, славенская лыжніца Петра Майдзіч, – змушаюць задавацца пытаннямі, большая частка якіх маюць маральны характар і наўпрост звязваюцца са здароўем чалавечай асобы, а больш шырока спрычыняюцца да вызначэння месца і ролі сучаснага спорту ў грамадстве ў цэлым і ягонага ўплыву на чалавечую адзінку.

Як вядома Міжнародны Алімпійскі камітэт правёў размежаванне ў тэрмінах правядзення Летніх і Зімовых Алімпійскіх гульняў такім чынам, каб яны не адбываліся ў адзін год. Такі маркетынгавы ход дазваляе падтрымліваць зацікаўленасць грамадства да гэтых падзеяў на адпаведна высокім узроўні, а з улікам таго, што Гульні папераменна адбываюцца раз на чатыры гады асаблівую каштоўнасць набывае не толькі званне алімпійскага чэмпіёна ці прызёра, а нават сам факт удзелу атлета ў спаборніцтвах планетарнага маштабу. Усё гэта вызначае адметнасць глабальнага характару Алімпійскіх гульняў, прэстыжнасць рэпрэзэнтацыі на іх кожнай краіны, абвостраную барацьбу за першынство, і, як наступства, сістэма ганарараў у адпаведнасці з занятым месцам.

Так, напрыклад, з краінаў постсавецкай прасторы самыя высокія ўзнагароды ў Ванкуверы былі ўсталяваныя Казахстанам: за залаты медаль – $250 тыс., за срэбны – $150 тыс., за бронзавы – $75 тыс. На Беларусі гэтыя лічбы складаюць 100 тыс., 50 тысячаў і 30 тыс. долараў адпаведна. Іншы парадак налічэння прызавых у Расіі, дзе распараджэннем урада гэтай краіны ад 06 жніўня 2008 года залаты медаль ацэнены ў €100 тыс., срэбны – у €60 тыс., бронзавы – у €40 тыс. Дадаткова прадугледжаныя ганарары ад спартыўных федэрацыяў, ад урадаў асобных рэгіёнаў, ад разнастайных фундацыяў. Па сукупных падліках двухразовы расійскі алімпійскі чэмпіён мог бы атрымаць у суме да аднаго мільёна долараў. У параўнанні з гэтымі лічбамі даволі сціпла выглядаюць канадцы, немцы, амерыканцы. Найлепш сумы выплатаў дэманструе Табліца 1.

*Табліца 1.*

***Сумы прызавых выплатаў асобнымі краінамі прызёрам Зімовых Алімпійскіх гульняў 2010 года ў Ванкуверы (Канада) у доларах ЗША***

| Краіна | Залаты медаль | Срэбны медаль | Бронзавы медаль |
|---|---|---|---|
| Балгарыя | 144.000 | 122.000 | 100.000 |
| Беларусь | 100.000 | 50.000 | 30.000 |
| Германія | 21.150 | 14.100 | 10.575 |
| ЗША | 25.000 | 15.000 | 10.000 |
| Казахстан | 250.000 | 150.000 | 75.000 |
| Канада | 20.000 | 15.000 | 10.000 |
| Малдова | 70.500 | 42.300 | 21.150 |
| Нарвегія | 13.500 | 8.500 | 5.000 |
| Расія | 141.000 | 84.600 | 56.400 |
| Украіна | 100.000 | 70.000 | 50.000 |
| Эстонія | 144.525 | 99.405 | 63.170 |

Крыніца: Апрацавана на падставе http://pressball.by/news.php?t=0707&id=64684, дата доступу 12.02.2010.

Такім чынам, з большага вядома, колькі каштуе алімпійскі медаль у выбраных краінах. Праўда, адразу кідаецца ў вочы несуразмернасць велічыні выплатаў прызавых для прызёраў Алімпіяды ў шэрагу постсавецкіх краінаў на ўзроўні ганарараў спартоўцаў з Германіі, ЗША, Канады і Нарвегіі. Зразумела, што прафесійны спорт выконвае абмысловыя функцыі ў грамадстве, аднак, якія магчымасці ў адносінах да заняткаў спортам мае насельніцтва краіны ў цэлым.

Калі звярнуцца да аналізу сацыяльнай рэальнасці на прыкладзе стану рэчаў у гэтай сферы на Беларусі, то можна прывесці некаторыя дадзеныя. Так, у 2008 годзе берасцейскія гарадскія ўлады закупілі ў італьянскай фірмы «Snowstar» сілавыя вузлы, помпы, чатыры снежныя гарматы і іншую спецыялізаваную тэхніку для вытворчасці штучнага снегавога покрыву коштам у адзін мільярд беларускіх рублёў (больш за €250 тыс. па курсу на люты 2010 года). Цёплая зіма 2008/09 года паказала высокую затратнасць гэтага праекту: на арганізацыю лыжні было выдаткавана BYR 30 млн., а вярнуць назад паспелі толькі дзесяць. На горад з насельніцтвам больш за 300 тыс. жыхароў для аматараў

пакатацца на лыжах на амаль двухкіламетровай трасе, якая знаходзіцца на беразе канала для веславання, прадугледжана ўсяго 70 камплектаў лыжаў фірмы «Fischer«, да якіх па шматлікіх просьбах гараджанаў дадалі яшчэ дваццаць, праўда, ужо інвентара беларускага вытворцы «Целяханы». Адна гадзіна пракату каштуе BYR 6300 (€1,6) [1].

Няцяжка падлічыць, у якую суму абыйдзецца такое правядзенне вольнага часу і фармаванне актыўнай пазіцыі адносна здаровага ладу жыцця для сям'і з трох чалавекаў, дадаць да гэтага выдаткі на транспарт, адпаведную спартыўную экіпіроўку і харчаванне. Для сярэднестатыстычнай сям'і выдаць такія сродкі са свайго бюджэту даволі складана, а калі прыняць пад увагу патрабаванне рэгулярнасці падобнага роду заняткаў, то ў такой сітуацыі прапаганда здаровага ладу жыцця нязменна судатыкаецца з разнастайнымі перашкодамі. Для характарыстыкі справаў у гэтым накірунку даволі сімптаматычна выглядаюць стаўкі арэнднай платы за спартыўныя залы. Так, стандартная зала берасцейскага спорткомплекса «Дынама», якая была пабудаваная яшчэ ў савецкія часы і патрабуе капітальнага рамонту, выставіла рахункі для аматараў спорту наступным чынам: снежань 2009 года – 2 млн. 824,4 тыс. руб. за 22 гадзіны, ці 128,4 тыс. руб. за гадзіну; студзень 2010 года – 3 млн. 006,4 тыс. руб. за 20,5 гадзіны, ці 146,7 тыс. руб. за гадзіну (114,3% у параўнанні з папярэднім месяцам); люты 2010 года – 1 млн. 059,1 тыс. руб. за 5 гадзінаў, ці 211,8 тыс. руб. за гадзіну (165% у параўнанні са снежнем 2009 года). У аплату кіраўніцтва спорткомплекса ўключала: арэнду зала; камунальныя затраты (электрычная энэргія, цеплавая энэргія, халодная вада, каналізацыя, вываз смецця, прыём сцёкавай вады); падатак за ўтылізацыю адкідаў вытворчасці; паслугі па ўтрыманню і эксплуатацыі спартыўнай пабудовы.

У той жа час на спажывецкім рынку складаецца неадназначная сітуацыя адносна вытворчасці і продажу алкагольных напояў. Нацыянальны статыстычны камітэт бесстаронна канстатаваў, што продаж лікёра-гарэлачных вырабаў на Беларусі ў 2009 годзе павялічыўся на 14,4%, а ўсяго алкагольных напояў і піва было рэалізавана на суму BYR 4904,9 млрд. (каля € 1,2 млрд.), што ў агульным аб'ёме рознічнага гандлёвага абароту дасягнула 12% [7]. Кошт адной паўлітровай бутэлькі гарэлкі вагаўся ў межах крыху больш за € 2, паўлітра піва – каля € 0,8.

Урад Беларусі, зразумела, занепакоены той сітуацыяй у сферы спажывання алкагольных напояў, якая складваецца ў краіне. Каб зрабіць насельніцтва больш цвярозым, Міністэрства гандлю вырашыла забараніць вытворчасць і рэалізацыю слабых алкагольных напояў. Вялікую заклапочаннасць выклікала тое, што па дадзеных Нацыянальнага статыстычнага камітэту спажыванне чыстага спірту на душу насельніцтва

дасягнула 12,4 літра. Першы намеснік міністра гандлю М. Свянціцкі зрабіў выснову, што гэта шмат: «Мы рашуча выступаем супраць вытворчасці і рэалізацыі слабых алкагольных напояў...», якія «... выпадаюць з-пад дзеяння закона аб рэгуляванні абароту алкагольнай прадукцыі» [4].

Разам з тым статыстыка слабых алкагольных напояў дае стабільныя прыбыткі. Па дадзеных Белстату за першыя шэсць месяцаў 2009 года спажыванне слабых алкагольных напояў на Беларусі дасягнула 658,4 тыс. дал у натуральным вымярэнні і павялічылася на 4,2% да узроўню аналагічнага перыялу папярэдняга году. У той жа час гарэлкі беларусы набылі ў 8 разоў больш (5,34 млн. дал), пладовага віна – у 11,5 разоў больш (7,58 дал), а піва – у 18 разоў больш (амаль 12 млн. дал) [там сама].

Культура правядзення вольнага часу моладзі ў цяперашнім глабалізаваным грамадстве істотна адрозніваецца ад таго, як гэта адбывалася ў папярэднія стагоддзі і дзесяцігоддзі. Сучасная моладзь сёння мае нашмат больш магчымасцяў і прапановаў, якія могуць прыцягнуць яе ўвагу. Але разам з тым камерцыялізацыя пераважнай бальшыні самых цікавых відаў сацыяльнай актыўнасці аўтаматычна памяншае колькасць суб'ектаў дзейнасці. Тое ж самае назіраецца і ў адносінах да спорту. Сродкі масавай інфармацыі распавядаюць пра найбольш важныя спартыўныя падзеі, пра высокія ганарары спартоўцаў, што, у сваю чаргу, стварае адпаведны рэйтынг самых прэстыжных відаў спорту. Але калі дэталізаваць варункі заняткаў тым ці іншым відам спорту з мэтай дасягнення высокага выніку, то атрымліваецца, што гэта вельмі дарагое задавальненне. Размова пра эканамічны бок нават не вядзецца, хоць калі падлічыць выдаткі на заняткі такімі відамі спорту як хакей ці тэніс, то для сярэднестатыстычнай беларускай сям'і яны з'яўляюцца вельмі высокімі. Разам з тым трэба ўлічваць таксама маральны аспект. У выпадку заняткаў спортам на ўзроўні чэмпіёнскіх дасягненняў атрымліваецца тое, што дзяцінства і юнацтва могуць застацца недзе ў баку, і ў параўнанні са сваімі равеснікамі патэнцыяльны спартовец-чэмпіён губляе практычна ўсё тое сацыяльнае дасведчанне, якое мог бы атрымаць у працэсе свайго індывідуальнага развіцця, г.зн. калі б спортам не займаўся. Менавіта таму, здаецца, маецца столькі асабістых трагедыяў пры пераходзе з юнацкага спорту ў спорт дарослых. І яшчэ адна акалічнасць: спорт абсалютна не дае аніякіх гарантыяў адносна поспеху. Да таго ж сучаснае спажывецкае грамадства пад агрэсіўным націскам масавай культуры сфармавала феномен «куплі-продажу» спартыўнай падзеі як тавару. І нашмат лягчэй «купіць» карцінку футбольнага матчу на абанеменцкую картку сатэлітарнага тэлебачання, чым асабіста прыняць удзел у звычайнай гульні. Дарэчы, прагляд футбольных

матчаў у барах, кавярнях і рэстарацыях за келіхам піва (а можа нават і не аднаго, калі браць пад увагу працягласць спартыўнага відовішча) даволі актыўна рэкламуецца, а пад час чэмпіянату Еўропу па футболе 2008 года ў Аўстрыі і Швейцарыі ўтвараліся адмысловыя фан-зоны з тэлебімамі, дзе можна было без перашкодаў набыць піва. Такі падыход атрымаў легалізацыю практычна па ўсім свеце. Нават на Беларусі, калі на найбуйнейшым спартыўным аб'екце краіны пад дахам «Мінск-Арэна» праводзіліся гульні першынства Кантынентальнай хакейнай лігі, аматары спорту маглі спакойна замаўляць піва.

Праблематыка здаровага ладу жыцця не можа быць абазначана без аналізу падставовых паняццяў. Большасць даследчыкаў канцэнтруюць увагу на табуізацыі пэўных патрабаванняў, напрыклад, не ўжываць алкаголь і наркотыкі, не паліць цыгарэты, не злоўжываць сексуальнымі адносінамі, не парушаць грамадскі парадак і г.д. Другая група навукоўцаў заклікае суграмадзянаў кіравацца агульнапрынятымі нормамі паводзінаў на падставе сэнсатворчых арыентацыяў на каштоўнасці: клопат пра сваё здароўе і дабрабыт блізкіх, альтруістычныя пачуцці, нацыянальная годнасць, пазітыўныя якасці людзей [см.: 2, 248]. Зразумела, што такі падыход можа ажыццяўляцца толькі на ўзроўні тэарэтычнага асэнсавання, таму што штодзённая практыка жыцця не дазваляе з адпаведнай дакладнасцю вызначыць той ці іншы аспект.

Здаровы лад жыцця дыялектычна звязваецца з варункамі, узроўнем і якасцю жыцця, а таксама з індывідуальнымі патрэбамі асобы. Немалаважнае значэнне тут мае таксама і датасоўны аспект, які ўключае прадмет і аб'ект зацікаўленасці. У паняцце прадмету ўваходзіць разуменне ладу жыцця ва ўзаемнай сувязі з патрэбамі. Да аб'екта зацікаўленасці адносіцца канкрэтная катэгорыя, напрыклад, моладзь з яе падзелам на гарадскую і сельскую, армейскую, студэнцкую і г.д., а таксама элементы-складальнікі здаровага ладу жыцця адпаведнага слою моладзі: здароўе, турызм, сфера працы, вучобы, фізічнай культуры і спорта і інш. [гл.: там сама, 251–252].

Паняцце «здаровы лад жыцця» гарманічна суадносіцца з прапанаванай Радай Еўропы канцэпцыяй «Спорт для ўсіх» і дастаткова добра дапасоўваецца да новых сацыякультурных, эканамічных і палітычных рэаліяў, якія сталі фармавацца на еўрапейскім кантыненце ў апошнія дваццаць гадоў. Рэгулярная спартыўная дзейнасць не мае сэнсу без далучэння да здаровага ладу жыцця. На канферэнцыі «Чысты і здаровы спорт для трэцяга тысячагоддзя» еўрапейскіх міністраў у Браціславе (2000), якія адказваюць за спорт у сваіх краінах, падкрэслівалася, што «спорт для ўсіх» становіцца з'явай першай ступені важнасці, нягледзячы на тыя этнічныя, культурныя і сацыяльна-эканамічныя межы, якія

існуюць. Інтэрпрэтацыя спорта ў такім разуменні вядзе да фармавання і распаўсюджвання яго пазітыўнага іміджу ў грамадстве ў цэлым, садзейнічае станаўленню сацыяльнага адзінства людзей, а акрамя таго павялічвае іх жыццёвы тонус шляхам далучэння да рэгулярных заняткаў у сістэме фізічнай актыўнасці насельніцтва на базе стабільнага ўзросту матэрыяльнага і духоўнага складальнікаў чалавечага развіцця [3].

Прапаганда і рэалізацыя ў штодзённай дзейнасці людзей здаровага ладу жыцця звязваюцца з шэрагам трывожных тэндэнцыяў, якія прасочваюцца ў функцыянаванні сучаснага глабалізацыйнага грамадства. Напрыклад, у еўрапейскіх краінах – гэта падзенне нараджальнасці, павелічэнне разнастайных паталогіяў у дзяцей і юнакоў, рэзкае памяншэнне рухавай актыўнасці насельніцтва. Моладзь у сістэме культуры правядзення вольнага часу ва ўсё большай ступені аддае перавагу кампутарным гульням і праглядам тэлевізійных праграмаў, выкарыстанню перавагі аўтамабільнага транспарту, змяшчэнню прыярытэтаў у бок патэнцыяльных поспехаў у будучай кар'еры, што ў цэлым вядзе да значнага абмежавання гульняў і забаваў на свежым паветры, разнастайных формаў пешых паходаў і г.д. Тэарэтычныя падыходы адносна паняцця «здаровы лад жыцця» сфармаваныя і прадстаўленыя для рэалізацыі ў сацыяльным асяроддзі.

Адзін з такіх падыходаў увасоблены ў Еўрапейскай хартыі «Спорт для ўсіх», дзе пазначаныя падставовыя прынцыпы. Кіраўнікі спартыўнай галіны шэрагу еўрапейскіх краінаў на адмысловай канферэнцыі ў Брусэлі (1975) вызначылі найважнейшыя накірункі, якія павінны дамінаваць у грамадстве і ствараць усе варункі для гарманічнага развіцця чалавечай асобы.

Адным з галоўных момантаў названай Хартыі з'яўляецца дэкларацыя права кожнага індывіда ўдзельнічаць у спорце. Незалежна ад сацыяльнага паходжання, рэлігійнага веравызнання, партыйнай прыналежнасці, дыферэнцыяцыі па ўзросту, размежавання па прыкмеце пола і г.д. далучэнне да спартыўнай актыўнасці адбываецца згодна з жаданнем чалавека без аніякага абмежавання як канстатацыя здаровага ладу жыцця. Спорт інтэрпрэтаваны як важнейшы фактар чалавечага развіцця, і ён адпаведна павінен быць падтрыманы з грамадскіх субсідыяў. Акрамя таго, як адзін з дамінантных аспектаў сацыякультурнага развіцця, ён павінен быць звязаны на лакальным, рэгіянальным і нацыянальным узроўні з іншымі галінамі напрацоўкі тактыкі і планавання, напрыклад, сферамі адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння, мастацтва, правядзення вольнага часу і г.д. Кожны ўрад такім чынам мае абавязак садзейнічаць пастаяннаму і эфектыўнаму супрацоўніцтву паміж грамадскай уладай і дабраахвотнымі арганізацыямі, заахвочваць стварэнне механізма функцыянавання спорта для ўсіх у распаўсюджванні

сістэмы здаровага ладу жыцця. Такі падыход дазваляе абараніць спорт ад палітычнай, камерцыйнай ці фінансавай эксплуатацыі, ад дэвіянтных паводзінаў, вызначыць яго ў якасці сродка, які супрацьстаіць, напрыклад, ужыванню алкаголя і наркотыкаў [6].

Такім чынам, у сістэме фармавання здаровага ладу жыцця спорт вызначаецца як адзін з найважнейшых феноменаў, які мае дачыненне як да кожнага асобнага індывіда, так і да грамадства ў цэлым. Аднак грамадская думка на падставе шырокага ўздзеяння сродкаў масавай інфармацыі акцэнтуе ўвагу хутчэй на выніку спартыўных спаборніцтваў і велічыню ганарараў найлепшых спартоўцаў, і ў той жа самы час па большасці ігнаруе тэндэнцыі ў накірунку да дэгуманізацыі грамадства, што праяўляецца, напрыклад, у павелічэнні спажывання алкагольных напояў і распаўсюджванню злачыннасці. Таксама пэўныя праблемы маюцца ў адносінах да даступнасці заняткаў спортам у сістэме здаровага ладу жыцця, калі ўзяць пад увагу фармаванне цэнавай палітыкі ў сферы платных паслугаў для насельніцтва. Для сучаснай моладзі ў культуры праводзення вольнага часу дамінуюць хутчэй тэндэнцыі ў накірунку да замацавання стэрэатыпаў на нездаровы лад жыцця.

*В статье акцентируется внимание на проблемах соотношения здорового и нездорового образа жизни, где спорт является одним из наиважнейших показателей развития общества. С одной стороны фиксируется рост материально-технической базы спорта, строительство современных спортивных объектов, а с другой, – рост производства алкогольных напитков и высокие цены за аренду спортивных сооружений. Несмотря на то, что разработан ряд общеевропейских программ, в которых декларируется право каждого человека на участие в спорте, в культуре проведения свободного времени молодёжи преимущественно доминируют установки на нездоровый образ жизни.*

*In article the attention is focused on problems of a parity of a healthy and unhealthy style of life where sports are one of the most important indicators of development of a society. On the one hand growth of material base of sports, building of modern sports objects, and with another, – growth of manufacture of alcoholic drinks and the high prices for rent of sports constructions is fixed. In spite of the fact that a number of the all-European programs in which the right of each person to participation in sports is declared is developed, in culture of carrying out of a free time of youth installations on an unhealthy way of life mainly dominate.*

1. Вечерний Брест. – 2010. – № 11. – 10 февраля.
2. Лаптёнок С.Д. Здоровый образ жизни молодёжи: понятие, сущность, основные направления // Молодёжь Беларуси на современном этапе: состояние, проблемы и пути их решения: книга для педагогов и организаторов воспитательной работы с молодёжью / Под ред. С.Д. Лаптёнка. Издание 2-е, исправленное и дополненное. – Мн.: ИСПИ, 2004. – С. 247–256.

3. http://cm.coe.int/ta/rec/2000/word/2000r16.doc, дата доступа 20.01.2004.
4. http://naviny.by/rubrics/economic/2009/07/21/ic_articles_113_163679/, дата доступу 12.02.2010.
5. http://pressball.by/news.php?t=0707&id=64684, дата доступу 12.02.2010.
6. http://www.coe.int/t/dg4/sport/resources/texts/spchart2_en.asp#TopOfPage, дата доступу 21.02.2009.
7. http://www.nn.by/index.php?c=ar&i=34852, дата доступа 09.02.2010.

*УДК 502.4 (476)*

**В.М. ПАПКО**

*Беларусь, Брэст, УА «БрДТУ»*

# СВЕЦКАЕ ЖЫЦЦЁ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ 1910–1930-х гг. ПА ЎСПАМІНАХ ЖАНЧЫН-ШЛЯХЦЯНАК

Балы і прыёмы з'яўляліся ў значнай ступені месцам дэманстрацыі вынікаў выхавання, прыгажосці, манер, густу і сацыяльнага статуса прадстаўнікоў шляхты. Нагодай для балоў і прыёмаў былі як календарныя штогадовыя падзеі – хрысціянскія святы, дні нараджэнняў і імянін, так і больш значныя падзеі ў жыцці – хрышчэнне дзяцей, паўналецце, вяселле.

Падрыхтоўка да балоў і прыёмаў мела свае асаблівасці, была справай сур'ёзнай і цягнулася не адзін месяц. Існавалі правілы, парушэнне якіх успрымалася, як праява нізкай культуры, некампетэнтнасці і дрэннага густу.

Важнае значэнне мела падрыхтоўка святочнага адзення і ўпрыгожванняў. Канец XIX – пач. XX стст. быў перыядам даволі значных зменаў у галіне моды. Тады ўжо існавалі модныя часопісы, якія служылі для стварэння штодзённага і святочнага адзення. Даволі папулярнымі ўпрыгожваннямі таго часу былі бусы з перлаў (жамчугу).

Балы – месца дэманстрацыі дзяўчын на выданні; яны ўспрымаліся як паважная справа бацькоў, каб скласці добрую партыю, трэба было вывозіць на балы, таму грошай на іх не шкадавалі. Гэта былі афіцыйныя мерапрыемствы, дзе маладыя мужчыны шукалі сабе будучых жонак, прыглядаліся да патэнцыйных родзічаў, іх адносінаў, маглі скласці ўяўленне аб іх матэрыяльным становішчы, сувязях і коле знаёмых.

Вельмі цікавай крыніцай па аднаўленні шляхецкай культуры Заходняй Беларусі (сучаснай Гродзеншчыны і Брэстчыны) з'яўляюцца